# [Выпушчаны ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «Жывапіс. І.Басаў» з серы і Жывапіс»]

21 верасня 2018 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «Жывапіс. І.Басаў» з серыі «Жывапіс», тыраж якога складае 20 тысяч.

Дызайн канверта і спецштэмпеля Марыны Віткоўскай. Спецыяльнае памятнае гашэнне будзе праходзіць 9 кастрычніка ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16).

**Марка**. Жывапіс. Ізраіль Басаў. Аўтапартрэт. Папера, туш. 1960 (на бел. мове, рэпрадукцыя твора І. М. Басава «Аўтапартрэт» (папера, туш, 1960).

**Ілюстрацыя**. Зялёны Мінск. Палатно, алей. 1961 (на бел. мове, рэпрадукцыі карцін І. М. Басава «Зялёны Мінск» (палатно, алей, 1961), «Мінск. Поўдзень» (палатно, алей, 1960).

*Басаў Ізраіль Мацвеевіч (Мардуховіч) (07.10.1918, г. Мсціслаўль Магілёўскай вобл. — 04.08.1994) — беларускі мастак, графік. Член Саюза мастакоў БССР (з 1959).*

*Творчасць Ізраіля Басава займае асобнае месца сярод пакалення вядомых беларускіх мастакоў другой паловы XX стагоддзя. Ён сфармаваў аблічча беларускага нонканфармісцкага мастацтва, ажыццявіў вяртанне да традыцый еўрапейскага мадэрнізму, стварыўшы свой выразны і пазнавальны стыль. Сёння яго творчасць стала каштоўным набыткам для шырокай публікі, а таксама для спецыялістаў.*

[http://www.belpost.by]

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/21-09-2018-3604*